дневности Левобережной Украины. К этому еще следует добавить более 90 памятников переписки родителей Н.В. Райзера между собой за 1801–1806 гг., чтобы в случае тщательного и успешного, с точки зрения содержательной, профессионального прочтения текстов развернуть весьма широкую панораму повседневной жизни первой половины XIX в. Мимоходом отметим, что в современной украинской историографии уже есть подвижнические примеры публикации подобных комплексов семейного эпистолярного наследия, что значительно облегчает работу историков-конкретчиков [3]. Любовь, любовные приключения, неудачное сватовство, свадьбы, скучная сельская жизнь провинциального дворянства, болезни, воспитание детей, хозяйственные, домашние и семейные дела – все это и многие другие темы были предметом обсуждения Райзеров и их корреспондентов.

Исключительный интерес представляют, так сказать, парные письма, которые писались одновременно двоюродными братом и сестрой Н.В. Райзера, Алексеем Степановичем и Анной Степановной Райзер, в 1840-е гг., а также родной сестрой Анастасией и ее мужем В.А. Кореневым в 40–50-е гг. XIX в. Этот круг людей связывали не только родственные, но и крепкие дружеские отношения. К тому же эти корреспонденты автора дневника занимались его поместными делами и постоянно «отчитывались» о результатах. Информационная насыщенность переписки довольно высока, поэтому для желающих исследовать не только социально-экономическую, но и, скажем, женскую историю, реконструировать образы идеального помещика и идеального крестьянина, существовавшие в воображении левобережного дворянства того времени, этот эпистолярный комплекс предоставляет значительные возможности.

Осознавая, что в коротком сообщении невозможно детально раскрыть информационный потенциал мощного фонда К.Н. Скаржинской, все же отметим, что материалы фамильных архивов этого собрания позволяют подойти к созданию коллективного портрета среднепоместного левобережного дворянства первой половины XIX в., которое делило свой досуг между хлевом и кабинетом, и таким образом историографически реабилитировать этот слой украинского общества, который заботился не только о собственном благосостоянии, но и о добросовестном исполнении своих общественных обязанностей, в том числе и по отношению к крестьянам.


1. Гісцова, Л.З. Родовий фонд Галаганів ЦДІАК України / Л. З. Гісцова // Архіви України. – 2000. – № 4/6. – С. 39–44.
2. Государственный архив Полтавской области. – Ф. 222. – Оп. 1. – Д. 2657.
3. Епістолярна спадщина родини Нечаєвих (кінець XVIII – перша половина XX століття) / упор. С. Абросимова, І. Анцишкін, Н. Сурева та інші // Джерела з історії Південної України. – Запоріжжя, 2003. – Т. 3. – 488 с.
4. Каминский, Ф.И. Следы древнейшей эпохи каменного века по р. Суле и ее притокам / Ф.И. Каминский // Труды III Археологического съезда. – Київ, 1878. – Т. 1. – С. 147–152.
5. Лазаревский, А. Отрывок из дневника полтавского помещика / А. Лазаревский // Киевская старина. – 1893. – Июнь. – С. 398–427.
6. Папакін, Г.В. Павло Скоропадський: патріот, державотворець, людина. Історико-архівні нариси / Г.В. Папакін. – К.: Видавничий дім «Альтернативи», 2003. – 282 с
7. Папакін, Г.В. Приватні архіви української родової еліти в національній історії другої половини XVII–XX ст. (на прикладі архівної спадщини роду Скоропадських) : автореф. дис. ...док. іст. наук / Г.В. Папакін. – Київ, 2005. – 25 с.
8. Сергієнко, Д.В. Меценатське подвижництво Катерини Скаржинської (1852–1932) / Д.В. Сергієнко // Наукові праці історичного факультету Запорізького національного університету. – Запоріжжя : ЗНУ, 2015. – Вып. 43. – С. 151–154.
9. Соколов, А.К. Социальная история: проблемы методологии и источниковедения / А.К. Соколов // Проблемы источниковедения и историографии. Материалы II Научных чтений памяти академика И.Д. Ковальченко. – М. : РОССПЭН, 2000. – С. 75–88.
10. Список членам и кандидатам Полтавского дворянского комитета по устройству быта помещичьих крестьян // Журнал землевладельцев. – 1858. – № 6. – Июль. – С. 158–159.
11. Супруненко, О.Б. Археологічні дослідження та зібрання Лубенського музею К.М. Скаржинської : дис... канд. іст. наук / О.Б. Супруненко. – Київ, 1997. – 16 с.
12. Феофилактов, К.М. О местонахождении кремневых орудий человека с костяками мамонта в с. Гонцах на реке Удай, Лубенского у., Полтавской губернии / К.М. Феофилактов // Труды III Археологического съезда. – Київ, 1878. – Т. 1. – С. 153–159.
13. Швидько, Г.К. Фамільні архіви Гетьманщини: аналіз археографічних публікацій / Г.К. Швидько // Український археографічний щорічник. – 2002. – Вип. 7. – С. 13–22.



**Антановіч З.В.**


## СКЛАД АРХІВА ЛЕПЕЛЬСКАГА СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАГА САБОРА Ў 1862–1864 гг.

Парафіяльныя цэрквы з'яўляліся ніжэйшымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі праваслаўнай царквы, архівы якіх камплектаваліся разнастайнымы матэрыяламі пераважна рэгіянальнага характару. Цалкам дакументальныя комплексы, нават за кароткі перыяд, не захаваліся ў выніку дрэнных умоў захоўвання, экспертызы каштоўнасці дакументаў і іншых фактараў. Таму, цікавасць выклікае архіў Лепельскага Спаса-Праабражэнскага сабора, які захаваўся за 1862–1864 гг. фактычна цалкам у фондзе 2531 "Полацкая духоўная кансісторыя" (ДУ "На-

Репозиторий ВГУ

цыянальны гістарычны архіў Беларусі”). Непасрэдна ў архіўным фондзе сабора за пазначаны прыяд маюцца толькі прыхода-расходныя кнігі і асобныя ўваходныя дакументы [3].

Лепельскі Спаса-Праабаражэнскі сабор у 1860-я гг. узначальваў Іякім Кудраўцаў, дыяканам быў Мацвей Аўчыннікаў, дзячком Стэфан Бялінскі, а панамаром Пётр Тучэўскі [2, арк. 39; 5]. Да яго былі прыпісаны цэрквы вялікамучаніцы Параскевы Пятніцы, на могілках і капліца [2, арк. 183–184]. Гаспадарчыя пытанні па храме разглядаліся прыхадскім саветам або царкоўнымі старастамі, якія абіраліся з ліку прыхаджан у залежнасці ад велічыні прыхода. У 1863 г. савет уключаў шэсць чалавек [2, арк. 1036–1041].

Справаводства канцэнтравалася ў настаяцеля сабора і бліжэйшага прычту. Аб’ём дакументаабароту ў разглядаемы час складаў каля 400 дакументаў у год з нязначным павелічэннем уваходнай дакументацыі ў 1863 г. [2, арк. 222–239, 639–657, 1113–1133]. У ім уваходная дакументацыя складала каля 70 % і ўключала указы (інструкцыі, правілы) кіраўніцтва епархіі і духоўнага праўлення або благачыння, адносіны, паведамленні. Пераважная частка выходнай дакументацыі, што займала каля 20–25 % агульнага аб’ёму дакументаабароту, тычылася ўзаемадзеяння з органамі канфесіянальнай і мясцовай грамадзянскай улады, прыватнымі асобамі. Унутраная дакументацыя складалася з метрычных кніг аб народжаных, шлюбаваных і памерлых, рэестраў ўваходнай, выходнай і іншай дакументацыі. У другой палове XIX ст. таксама вяліся “сшыткі сабора па розных справах”. У іх адзначаліся месяц і дзень, нумар дакумента, каму або куды ён адрасаваны, а таксама распіска атрымальніка [2, арк. 682–690].

Матэрыялы справаводства цэркваў увогуле і Лепельскага сабору ў прыватнасці па функцыянальнай прыкмеце падзяляюцца на сістэмы агульнай і спецыяльнай (канфесіянальнай) дакументацыі. Да распарадчай дакументацыі (першая падсістэма агульнай дакументацыі сабора) адносяцца ўказы, цыркуляры, прапановы, інструкцыі, якія настаяцель сабору атрымліваў з кансісторыі. Напрыклад, у 1861 г. кансісторыяй перасылаўся ўказ аб неабходнасці “асцярожна” замяніць польскі буквар, які быў выдадзены ў Варшаве, для супрацьдзеяння яго распаўсюджванню сярод праваслаўных жыхароў Полацкай епархіі [2, арк. 14].

Перапіска (другая падсістэма агульнай дакументацыі) ажыццяўлялася паміж настаяцелем сабора і Полацкай праваслаўнай кансісторыяй, а таксама з органамі мясцовага кіравання. У кансісторыю прадстаўляліся звесткі пра зборы ахвяраванняў на карысць паломнікаў у Палясціне, паляпшэнне быту праваслаўнага духавенства, існаванне брацтваў. Епархіяльным кіраўніцтвам выдзяляліся сродкі на ўтрыманне і ўзнагароджанне прычту, выпіску кніг і газет рэлігійнага зместу. У органы мясцовай улады (гарадскія думы і ўправы, паліцэйскія праўленні і інш.) І. Кудраўцавым прадстаўляліся звесткі, напрыклад, аб асобах, якія пражываюць у г. Лепелі без афіцыяльнага дазволу. Саборам таксама праводілася ўпарадкаванне прылеглых тэрыторый, удзел у мерапрыемствах па забеспячэнні грамадскай бяспекі, напрыклад, вартаўніцтве ў саборы ноччу на працягу 1863 г. [2, арк. 487–492]. Правядзенне грамадскіх сходаў і крыжовых хадоў абавязкова ўзгаднялася з органамі паліцыі. Цікава, што па адносінах грамадскіх аб’яднанняў мог прадстаўляцца доступ да архіва сабора, як А.М. Семянтоўскаму, члену-супрацоўніку расійскага геаграфічнага таварыства і сакратару віцебскага статыстычнага камітэта [2, арк. 636–638].

Перапіска ажыццяўлялася пасродкам паведамленняў, адносінаў і рапартаў. Для ўдакладнення асобных звестак накіроўваліся адносіны, а ў мэтах інфарміравання – паведамленні. Гэтыя віды дакументаў складаліся на рускай мове па ўстойлівым фармуляры. Уверсе аркуша пазначаўся зварот да адрасата. У асноўнай частцы агаворваліся перадумовы звароту і запатрабаваныя звесткі. Заканчэнне складалася з формулы ветлівасці і подпісу. Рапартамі ажыццяўлялася камунікацыя паміж настаяцелям сабора і Полацкай кансісторыяй. Гэтыя дакументы далучаліся ў якасці суправаджальных лістоў да звестак, накіраваных у кансісторыі і справаздач. Рапарты складаліся па ўзоры з трох частак. У першай – уступе – адзначаліся адрасат і адрасант. У другой прыводзілася абгрунтаванне напісання рапарта, аргументы або тлумачэнні аўтара і яго прапановы. У заключэнні змяшчаўся подпіс аўтара, а ў левым ніжнім вугле аркуша пазначаліся дата і месца напісання.

Дакументацыя па асабовым складзе духавенства (трэцяя падсістэма агульнай дакументацыі) ўключае кліравыя ведамасці духавенства, справы аб рукапалажэнні, ўзнагароджанні святарства, прызначэнні царкоўных стараст, дазволе духавенству і членам прычту на наведванне сваякоў або выезд за межы павета. Напрыклад, у 1863 г. паўнамоцтвы бабыліцкага благачыннага Вікта-



Рэпазіторый ВДУ

ра Ігнатовіча былі часова распаўсюджаны на лепельскае, а дзячок Стэфан Былінскі атрымаў дазвол выехаць у в. Дабея Полацкага павета па ўласных патрэбах [2, арк. 515–518]. У архіве Лепельскага сабора захоўваліся і справы па абвінавачваннях духавенства, так у 1864 г. з-за неадпаведнага выканання абавязкаў Івана Замкоўскага старастай Лепельскага сабора быў прызначаны Андрэй Лазура [2, арк. 770–773]. У іншым выпадку дзячок Завечэльскай царквы Фёдар Рыбакоў падазраваўся ў злоўжыванні "гарачымі напоямі" [2, арк. 1051–1061].

Найбольшае значэнне сярод рэгістрацыйна-ўліковых форм дакументаў мелі рэестры ўваходнай і выходнай дакументацыі, таму што яны адлюстроўваюць справаводства ўстаноў. У Лепельскім саборы рэестры афармляліся ў выглядзе табліцы з пяці граф: дата атрымання (месяц і дзень), нумар, змест дакумента, нумар справы, якой тычыцца дакумент, нумар дакумента з адказам [2, арк. 222–239]. Распарадчыя дакументы (цыркуляры, указы і прадпісанні) кансісторыі, духоўнага праўлення і благачыння фіксаваліся ў спецыяльным журнале, які афармляўся ў выглядзе табліцы: месяц і дата атрымання, нумар, змест дакумента, прынятае рашэнне. Напрыклад, у 1861 г. Лепельскім саборам было атрымана 76 распарадчых дакументаў [2, арк. 1–39].

Значнае месца сярод адміністрацыйных спраў (першая падсістэма канфесіянальнай дакументацыі) займала будаўніцтва і рамонт цэркваў. У 1862 г. царква Параскевы Пятніцы была ў дрэнным стане. Прыхаджане сабралі 500 руб. і прасілі кансісторыю дазволіць зрабіць рамонт, што было задаволена і ў 1868 г. яна была адноўлена [2, арк. 163–167]. Па прашэннях заблоцкага і франопальскага сялянскіх таварыстваў на царкоўнай зямлі, план якой далучаны да справы, у 1864 г. было пабудавана вучылішча [2, арк. 603–631].

Распараджэнне царкоўнай маёмасцю адбывалася па ўзгадненні з вышэйстаячымі органамі канфесіянальнага кіраўніцтва, як пры забароне падрываць гару царкоўнай зямлі на правым беразе ракі Эсы [2, арк. 476]. Пытанні па справах аб незвароце духавенствам пазык разглядаліся пры суме звыш 50 руб. кансісторыяй або благачыннымі саветамі, калі кошт скаргі быў меньшым [0, арк. 66–66 адв.]. Напрыклад, 9 руб. на карысць віцебскай мяшчанкі Эткі Розенфельд было выплачана дыяканам Лепельскага сабору М. Аўсянкіным [2, арк. 477–486].

Прыхода-расходныя кнігі і вопісы царкоўнай маёмасці адносіліся да уліковай дакументацыі (другая падсістэма канфесіянальнай дакументацыі). Прыхода-расходныя кнігі пераважна складаліся ў выглядзе табліцы, часам выкананай тыпаграфскім спосабам. На першым аркушы адзначалася дата (месяц і дзень), імя, прозвішча і саслоўная прыналежнасць ахвярадаўцаў, а таксама сумы. На другім – аналагічныя звесткі, толькі акрамя пазначэння асобы маглі быць звесткі аб арэнднай плаце, набыцці неабходных прадметаў культу і інш. [4].

Рэгістрацыя грамадзянскага стану з'яўлялася выключнай функцыяй царквы і адпаведна яе дакументаванню надавалася ўвага (трэцяя падсістэма канфесіянальнай дакументацыі). Азначаная функцыя рэалізоўвалася шляхам запаўнення метрычных кніг аб народжаных, перадшлюбных вобысках, шлюбаваных і памерлых. Белавыя шнураваныя кнігі перадаваліся з кансісторый за пасрэдніцтвам духоўных праўленняў і благачынных, а па заканчэнні года рэвізаваліся з перадачай копій у азначаныя ўстановы на захоўванне [5]. Звесткі аб народжаных акрамя органаў канфесіянальнага кіраўніцтва прадстаўляліся ў органы аховы здароўя для складання спісаў прышчэпвання [2, арк. 1]. Выпісы з іх выдаваліся кансісторыямі, аднак матэрыялы па правядзенні следства ў выпадку сумніўных запісаў, як сына лепельскага прыхаджаніна Васілія Лукашова, адкладаліся ў саборы [2, арк. 731–734].

У справы фарміраваліся пасведчанні аб дазволе ўзяць шлюб. Напрыклад, шлюбаванне Агаф'і Максімавай і Стэфана Вайцахоўскага адбывалася ў Лепельскім саборы, куды яны прадставілі пасведчанні адпаведных валасных праўленняў аб адсутнасці перашкод [2, арк. 83]. У іншым выпадку камандзір 44-й ваенна-працоўнай роты 11-й акругі шляхоў зносін дазваляў вянчацца радавому каталіку Будрэвічу (*імя невядома*) і праваслаўнай дзяўчыны Праскоўі Фёдаравай [2, арк. 79]. Пры гэтым выключнае значэнне мела распіска аб выхаванні дзяцей ў праваслаўнай веры. Яна замацоўвалася подпісамі двух сведак, святаром і членамі прычту [2, арк. 212]. У асобныя справы фарміраваліся адносіны з лепельскага гараднічага праўлення, шпіталя аб пахаванні памерлых, як у дачыненні Івана Пятрова [2, арк. 43].

Да гэтай падсістэмы канфесіянальнай дакументацыі таксама адносіліся спаведныя спісы. Напрыклад, спіс ніжніх чыноўнікаў за 1863 г. ўключаў 45 сем'яў і быў аформлены ў выглядзе табліцы: нумар, імя і прозвішча з пазначэннем звання, узрост, наяўнасць на споведзі [2, арк.

Репозиторий ВГУ

393–472]. Цікава, што споведзь ніжэйшых чыноў магла адбывацца на месцы нясення службы [2, арк. 175].

Афармленне міжканфесіянальных пераходаў (чацвёртая падсістэма канфесіянальнай дакументацыі) мела ўласцівасці, якія тычыліся неабходнасці навучання і хрышчэння іўдзеяў і мусульман. Пры гэтым, калі далучаўся непаўналетні, то тэрмін навучання складаў не менш 6 месяцаў [2, арк. 17]. Прадстаўнікі інаслаўных веравызнанняў не мелі перашкодаў пры далучэнні да праваслаўя. Іх спісы або паведамленні, калі змена канфесінальнай прыналежнасці не насіла масавы характар, перадаваліся ў кансісторыю, як пра раскольніка Галактыёна Філіпенка [2, арк. 999–1000].

Судовыя справы (пятая падсістэма канфесіянальнай дакументацыі) аб скасаванні шлюбу і накладанні епітымій разглядаліся Полацкай духоўнай кансісторыяй, аднак іх вынікі афармленыя копіяй указа накіроўваліся у мэтах кантролю выканання прысуду настаяцелю сабора, калі абвінавачаны быў яго прыхаджанінам. Напрыклад, пры Лепельскім саборы з 1863 г. выконваў сямігадовую епітым’ю за блуд унтэр-афіцэр ніжэгародскага рэзервовага палка Дзмітрый Яўсеенка [2, арк. 529].

Такім чынам, захаванасць архіва Лепельскага Свята-Праабражэнскага сабора за 1861–1864 гг. дазваляе ацаніць як аб’ём, так і склад дакументаабароту ніжэйшай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі праваслаўя – царквы. У азначаны перыяд у саборы штогадова фарміравалася каля 25 спраў, што адносіліся да агульнай і канфесіянальнай сістэм справаводнай дакументацыі. У архіў не трапіла пратакольная дакументацыя (агульная справаводная дакументацыя) і ўліковая дакументацыя (прыхода-расходныя кнігі), што маглі быць не завершаны справаводствам на момант перадачы спраў, метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых. Захаваны комплекс дакументаў сведчыць пра адказнае стаўленне настаяцеля сабора да дакладнага дакументавання сваёй дзейнасці, агульныя падыходы ў афармленні дакументаў на ўсіх ступенях іерархіі царквы, а таксама пра ўзаемадзеянне духавенства з органамі дзяржаўнага і канфесіянальнага кіраўніцтва, прыватнымі асобамі, ролю царквы на грамадска-палітычнай арэне Лепельшчыны 1860-х гг.

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 34.
2. НГАБ. – Ф. 2531. Воп. 1. Спр. 41.
3. НГАБ. – Ф. 2576. Воп. 1.
4. НГАБ. – Ф. 2476. Воп. 1. Спр. 38.
5. Рыбчонак, С. А. Крыніцы па генеалогіі Беларусі XVI – пачатку XX ст. : Метадыч. парады / С. А. Рыбчонак. – Мінск : БелНДІДАС, 2003. – 76 с.
6. Сементовский, А. М. Витебск и уездные города Витебской губернии : с тринадцатью политипажами в тексте и портретом архиепископа Полоцкого и Витебского Василия / А. М. Сементовский. – Санкт-Петербург : Тип. К. Вульфа, 1864. – 136 с.

**Сыцько К.В.**

## ДАКУМЕНТЫ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА НА БЕЛАРУСІ ЯК КРЫНІЦА ПА МІКРАГІСТОРЫІ

З развіццём айчыннай гістарычнай навукі і паступовым паглыбленнем ведаў па гісторыі Беларусі, тым не менш, застаюцца г. зв. “белыя плямы” выкліканыя вялікімі стратамі дакументальных помнікаў за, напрыклад, часамі Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым кантэксце актуалізуюцца пытанні пошуку і ўвядзення раней невядомых гістарычных крыніц у навуковы абарот.

Адным з такіх відаў крыніц з’яўляюцца дакументы, якія ствараліся ў дзейнасці парафіяльных і філіяльных культавых устаноў Рымска-каталіцкага Касцёла на Беларусі ў XVIII–XX стст. і захоўваюцца ў парафіях на дадзены момант. Дадзеныя дакументакомплексы, нажаль, з’яўляюцца маладаследаваным бокам айчыннага крыніцазнаўства, аб чым сведчыць дастаткова нешматлікая колькасць апублікаваных спарадычных артыкулаў па вызначанай праблематыцы (гл. напрыклад: [8], [10]).

Разам з тым нельга не адзначыць важнасць і высокую крыніцазнаўчую вартасць дадзеных матэрыялаў перадусім, як крыніц па гісторыі невялікіх гарадоў, мястэчак, вёсак і г. д., то бок, па-факту – крыніц мікрагістарычнага характару.

Улічваючы тэзісны характар дадзенага артыкула, аўтар лічыць неабходным раскрыць абазначанае вышэй палажэнне на прыкладзе найбольш захаваных комплексаў матэрыялаў з касцё-



Репозиторий ВГУ